# ВЫВУЧЭННЕ ЎЗРОЎНЮ СФАРМІРАВАНАСЦІ ЎМЕННЯ АНАЛІЗАВАЦЬ ВОБРАЗ ЛІТАРАТУРНАГА ГЕРОЯ ВУЧНЯМІ III КЛАСА

*Селятыцкая Аліна Алегаўна*

УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»

У пачатковай школе ўрокі літаратурнага чытання прадугледжваюць мэту, якая заключаецца ў маральным выхаванні і развіцці дзяцей на аснове паўнавартаснага ўспрымання мастацкага тэксту, засваення вучнямі асноўных літаратуразнаўчых ведаў і практыкі чытацкай дзейнасці [1, с. 309].

Для вызначэння ўзроўня сфарміраванасці ў малодшых школьнікаў ўмення аналізаваць вобраз літаратурнага героя, мы правялі эксперыметальнае даследаванне праводзілася ў 3 «А» класе Дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 32 г. Гродна». Пры гэтым у якасці кантрольнага быў узяты 3 «Б» клас гэтай жа школы. Эксперыментальнае даследаванне праходзіла ў тры этапы і складалася з канстатавальнага, фарміравальнага і кантрольнага эксперыментаў.

Падчас канстатавальнага эксперыменту былі пастаўлены наступныя задачы: даследаваць і вызначыць узровень фарміравання ўмення аналізваць вобраз літаратурнага героя вучнямі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі. У працэсе правядзення канстатавальнага эксперыменту былі выкарыстаны наступныя метады даследавання: педагагічнае назіранне, аналіз пісьмовых работ дыягнастычнага характару, навучальных работ, вучэбных праграм і падручнікаў па беларускай літаратуры для 3 класа, статыстычны аналіз вынікаў эксперыменту.

Для вызначэння ўзроўню сфарміраванасці ў малодшых школьнікаў умення аналізаваць вобраз героя ў жанры літаратурнага апавядання, мы правялі эксперымент на базе Дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 32 г. Гродна»  ў 3 «А» і 3 «Б» класах. У дадзеным эксперыменце прымалі ўдзел 34 вучні 3 класа.

За кожны правільны разгорнуты адказ на пастаўленае пытанне; правільна апісаны партрэт і ўчынкі героя; дакладна выяўленыя і правільна сфармуляваныя думкі вучань атрымлівае па 1 балу.

За кароткі адказ на пытанні, не дакладную характарыстыку героя і яго ўчынкі вучань атрымлівае 0,5 бала.

Калі вучань не можа апісаць героя і яго ўчынкі і адказ не мае дачынення да гэтага пытання, то адказ ацэньваецца ў 0 балаў.

Для вызначэння ўзроўня сфарміраванасці ўмення аналізу літаратурнага вобраза былі вылучаны наступныя крытэрыі:

Нізкі ўзровень (0–4 балаў) –вучань не можа дакладна сфармуляваць адказ на пастаўленае пытанне; дае няправільная апісанне героя і яго учынкаў; не разумее прычыны паводзін герояў.

Сярэдні ўзровень (4,5–7,0 балаў) – вучань дае кароткі адказ на пастаўленыя пытанні, не поўна характарызуе героя і яго ўчынкі; не да канца разумее ўчынкі герояў.

Высокі ўзровень (7,5–10 балаў) – вучань дае правільны і разгорнуты адказ на пастаўленае пытанне; поўна і дакладна апісвае партрэт і ўчынкі героя; правільна аналізуе прычыны яго учынкаў.

Прааналізуем якасць адказаў на кожнае пытанне 3 «А» і 3 «Б» класа.

1) З якімі героямі знаёмімся мы ў творы?

На дадзенае пытанне кожны з вучняў 3 «А» адказаў па-рознаму. Поўныя разгорнутыя адказы былі ў наступных ў пяці вучняў; няпоўныя адказы – у дзевяці; усе астатнія вучні далі кароткія адказы на пастаўленае пытанне.

Вучні 3 «Б» адказалі насутпым чынам: вучні пад нумарамі 3-5,17 далі поўны адказ – чатыры вучні, частковы адказ – дзевяць, астанія вучні далі кароткі адказ на пытанне.

2) Ад імені каго ідзе  паведамленне ў творы?

3 «А» клас: адзін вучань адказаў аднаскладова на пытанне, не аргументаваў сваю пазіцыю. Дзевяць навучэнцаў далі поўны і разгорнуты адказ на пытанне, аргументавалі сваю пазіцыю.

3 «Б» клас: тры вучні адказалі аднаскладова на пытанне, не аргументавалі сваю пазіцыю. Восем навучэнцаў далі поўны і разгорнуты адказ на пытанне, аргументавалі сваю пазіцыю.

3) Чым быў заняты аўтар?

Пяць вучняў 3 «А» адказалі поўна і правільна на пытанне. Два вучні 3 «Б» класа адказалі на  пытанне правільна.

4) Што прывабіла ўвагу аўтара?

Чатыры вучні 3 «А» дакладна і правільна адказалі на пастаўленае пытанне, шэсць вучняў не змаглі адказаць на гэтае пытанне,астатнія адказалі часткова. Сярод вучняў 3 «Б» класа чатыры вучні адказалі правільна на пастаўленнае пытанне, дзесяць вучняў адказалі частова,а астанія далі няпоўны адказ .

5) Што ўбачыў аўтар выглянуўшы з-за куста?

На гэта пытанне правільна адказалі пяць вучняў 3 «А» і тры вучні 3 «Б» класа, часткова правільны адказ далі восем вучняў 3 «А» класа і адзіннаццаць вучняў 3 «Б» класа.

6) Што адбылося,калі аўтар убачыў, як птушка крыўдзіць зайку?

Поўны дакладны адказ далі чатыры вучні 3 «А» класа і пяць вучняў 3 «Б» класа, дзевяць вучняў 3 «А» класа і восем 3 «Б» класа пры адказе далі часткова правільны адказ .

7) Чаму аўтар дапамог зайку?

Не далі адказу на пытанне пяць вучняў 3 «А» і шэсць 3 «Б», правільна адказалі – чатыры вучні 3 «А» і пяць 3 «Б»,не поўны адказ далі восем вучняў 3 «А» і шэсць вучняў 3 «Б».

8) Чаму зайку назвалі Лістападнік?

Поўны адказ далі чатыры вучні 3 «А» і шэсць 3 «Б», часткова правільны адказ – чатыры вучні 3 «А» і восем 3 «Б», няма адказу – дзевяць вучняў 3 «А» і тры вучні 3 «Б» класа.

9) Як зайка выглядаў?

Апісанне зайку далі правільна чатыры вучні 3 «А» і шэсць 3 «Б» класа, часткова правільна апісалі сем вучняў 3 «А» і сем вучняў 3 «Б» класа.

10) Чаму аўтар не забраў зайчыка домоў? Як яго гэта характарызуе?

Поўна раскрылі пытанне чатыры вучні 3 «А»класа і два вучня 3 «Б» класа,та шэсць вучняў 3 «А» і сем вучняў 3 «Б» класа не зразумелі дзеянні аўтара, таму адказалі часткова правільна на пытанне.

Такім чынам, вынікі дыягностыкі сфарміраванасці ўмення аналізаваць вобраз літаратурнага героя ў малодшых школьнікаў паказалі ў большасці сярэдні і нізкі ўзроўні. У сувязі з гэтым праводзілася праца па фарміраванні ўмення аналізаваць вобраз літаратурнага героя ў малодшых школьнікаў.

Падчас фарміравальнага эксперыменту намі быў распрацаваны комплекс практыкаванняў, якія садзейнічалі фарміраванню ў вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ўмення аналізаваць вобраз літаратурнага героя, а таксама спрыяюць выпрацоўцы такіх навыкаў паўнацэннага чытання, як свядомасць і выразнасць. Распрацаваны комплекс дазваляе эфектыўна арганізаваць групавую працу на ўроках; спрыяе ўдасканаленню практычных уменняў і навыкаў вучняў I ступені агульнай сярэдняй адукацыі; дазваляе індывідуалізаваць працэс навучання;

павышае цікавасць да ўрокаў па літаратурным чытанні ; актывізуе пазнавальную дзейнасць; развівае творчы патэнцыял кожнага вучня класа.

Задачай кантрольнага эксперыменту было праверыць, ці сапраўды комплекс практыкаванняў на аснове займальнага матэрыялу садзейнічае фарміраванню ўмення аналізаваць вобраз літаратурнага героя вучнямі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

На пачатку кантрольнага эксперыменту мы яшчэ раз правялі метадычныя дыягностыкі фарміравання ўмення аналізаваць вобраз літаратурнага героя вучнямі на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі выкарыстаўшы змененыя пытанні:

Тэма: Уладзімір Ліпскі «Медсястра»

Прааналізуем якасць адказаў на кожнае пытанне 3 «А» і 3 «Б» класа.

1) Колькі герояў ў творы?

На дадзенае пытанне кожны з вучняў 3 «А» адказаў па-рознаму. Поўныя разгорнутыя адказы былі ў сямі вучняў; няпоўныя адказы былі ў дзесяці вучняў.

Вучні 3 «Б» адказалі насутпым чынам: 5 вучняў далі поўны адказ, частковы адказ – дзевяць вучняў, астанія вучні далі кароткі адказ на пытанне.

2) Чым былі заняты мама з Марынкай і бабуля?

3 «А» клас: адзін вучань адказаў аднаскладова на пытанне, не аргументаваў сваю пазіцыю. Восем навучэнцаў далі поўны і разгорнуты адказ на пытанне, аргументавалі сваю пазіцыю.

3 «Б» клас: два вучні адказалі аднаскладова на пытанне, не аргументавалі сваю пазіцыю. Сем навучэнцаў далі поўны і разгорнуты адказ на пытанне, аргументавалі сваю пазіцыю.

3) Чаму Марынка падхапілася, калі бабуля зайшла ў пакой? Як бабуля выглядала?

Восем вучняў 3 «А» адказалі поўна і правільна на пытанне. Восем вучні 3 «Б» класа адказалі на  пытанне правільна .

4) Куды бабуля збіралася?

Шэсць вучняў 3 «А» дакладна і правільна адказалі на пастаўленае пытанне, чатыры вучняў не змаглі адказаць на гэтае пытанне,астатнія адказалі часткова. Сярод вучняў 3 «Б» класа пяць вучняў адказалі правільна на пастаўленнае пытанне, дзевяць вучняў адказалі частова,а астанія далі няпоўны адказ .

5) Што даведалася Марынка пра бабулю?

На гэта пытанне правільна адказалі сем вучняў 3 «А» класа і пяць вучняў 3 «Б» класа; часткова правільныя адказы размеркаваліся дзевяць на адзіннаццаць.

6) Кім зараз пацуе бабуля?

Поўны дакладны адказ далі сем вучняў 3 «А» класа і шэсць вучняў 3 «Б» класа, дзевяць вучняў 3 «А» класа і дзесяць 3 «Б» класа пры адказе далі часткова правільны адказ.

7) Што адбылося з Марынкай пасля прагляду альбома з фотаздымкамі?

Не далі адказу на пытанне два вучня 3 «А» і восем 3 «Б», правільна адказалі – чатыры вучні 3 «А» і чатыры 3 «Б», не поўны адказ далі дзесяць вучняў 3 «А» і пяць вучняў 3 «Б».

8) Чаму Марынцы не хацелася глядзець вясёлыя мультфільмы?

Поўны адказ далі шэсць вучні 3 «А» і шэсць 3 «Б», часткова правільны адказ – восем вучняў 3 «А» і дзесяць 3 «Б», няма адказу – тры вучні 3 «А» і адзін вучань 3 «Б» класа.

9) Навошта Марынцы спатрэбіліся вата, бінт і ніткі?

Прычыну, па якой Марынцы спатрэбіліся вата, бінт і ніткі, растлумачылі пяць вучняў 3 «А» і пяць 3 «Б» класа, часткова правільна апісалі прычыну дванаццаць вучняў 3 «А» і адзінаццаць вучняў 3 «Б» класа.

10) Чаму яна дапамагла сваім цацкам і захацела дапамагчы маме? Што адбылося з Марынкай ў той вечар?

Поўна раскрылі пытанне сем вучняў 3 «А» класа і два вучні 3 «Б» класа,а шэсцьвучняў 3 «А» і восем вучняў 3 «Б» класа не зразумелі дзеянні аўтара,таму адказалі часткова правільна на пытанне.

Як паказваюць вынікі, пасля правядзення сістэматычнай працы з выкарыстаннем распрацаванага комплексу займальных заданняў і практыкаванняў ўзровень актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў эксперыментальнага класа значна павысіўся:

– пасля правядзення сістэматычнай працы з выкарыстаннем распрацаванага комплексу практыкаванняў узровень фарміравання ўмення аналізаваць вобраз літаратурнага героя вучнямі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі эксперыментальнага класа змяніўся наступным чынам: высокі ўзровень павысіўся на 26,4%, сярэдні павысіўся – на 5,2%, а нізкі зменшыўся на 31,6%;

– у кантрольным класе высокі ўзровень фарміравання ўмення аналізаваць вобраз літаратурнага героя вучнямі на ўроках беларускай

літаратуры павысіўся на 11,7%, сярэдні ўзровень павысіўся на 11,75, а нізкі ўзровень зменшыўся на 0,1%.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што планамерная і сістэматычная праца па фарміраванні ўмення аналізаваць вобраз літаратурных герояў з дапамогай комплексаў практыкаванняў эфектыўна ўздзейнічае на ўменне аналізаваць вобраз літаратурных герояў на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі і заахвочвае іх і далей старанна вывучаць літаратуру.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Рыбникова, М. А. Очерки по методике литературного чтения / М. А. Рыбникова. – 3-е изд. – М. : Учпедгиз, 1963. – 313 с.
2. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэбны дапаможнік для 3 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовай навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2018.